УДК 82(048.3)

Г. Ф. Швед, ст. выкл. (БДТУ, г. Мінск)

# РЭФЕРАТ ЯК ЖАНР НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Рэферат – кароткі выклад зместу дакумента або або яго часткі, які ўключае асноўныя фактычныя звесткі, вывады, неабходныя для першапачатковага азнаямлення з дакументам і вызначэнне мэтазгоднасці звароту да яго.

Рэферат з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных жанраў пісьмовага паведамлення.

Рэфераванню падлягае пераважна навуковая і тэхнічная літаратура, у якой утрымліваецца новая інфармацыя.

Рэферат, як правіла, не прызначаецца для замены першакрыніц. Ён толькі дапамагае чытачу адабраць патрэбную яму літаратуру, дае асноўныя звесткі пра змест першаснага дакумента.

Рэфераты падзяляюцца па паўнаце выкладу зместу на:

- інфарматыўныя (рэфераты-канспекты), якія змяшчаюць у абагульненым выглядзе ўсе асноўныя палажэнні першаснага дакумента, іх ілюстрацыю, найважнейшую аргументацыю, звесткі пра методыку даследвання, выкарыстанае абсталяванне, сферы прымянення;
- індыкатыўныя (указальныя, або рэфераты-рэзюмэ), якія змяшчаюць не ўсе, а толькі асноўныя палажэнні.

Па колькасці рэфераваных першасных дакументаў на:

- манаграфічныя, складзеныя на падставе аднаго дакумента;
- аглядныя (або агляд), складзеныя па некалькіх дакументах на адну тэму.

Па чытацкім прызначэнні на:

- агульныя, у якіх пераказваецца змест у цэлым, разлічаны на шырокае кола чытачоў.
- спецыялізаваныя, у якіх пераказ зместу арыентаваны на спецыялістаў пэўнай галіны ведаў.

Па складанні:

- аўтарамі (аўтарэфераты);
- спецыялістамі ў той галіне, да якой адносіцца першасны дакумент;
- прафесіяналамі-рэферэнтамі (у тым ліку і перакладчыкамі-рэферэнтамі).

У ВНУ часта выкарыстоўваецца агульны рэферат, ў якім пераказваецца змест у цэлым, што разлічаны на шырокае кола

чытачоў або слухачоў. Калі такі рэферат прэзентуецца ў аўдыторыі, то можа быць названы як рэферат-даклад.

Праца над рэфератамі-дакладамі, пачынаецца з выбару тэмы рэферата і падбору неабходнай літаратуры.

Выбраўшы такую літаратурную працу, неабходна затым прыступіць да яе ўважлівага вывучэння і канспектаывання.

Пасля асэнсавання законспектаванага матэрыялу першакрыніц і яго групоўкі неабходна прыступіць да складання плана рэферата і спіса выкарыстанай літаратуры.

План рэферата павінен уключаць уводзіны, асноўную частку, заключэнне і літаратуру.

Ва ўводзінах студэнт абгрунтоўвае актуальнасць выбранай тэмы, яе тэарэтычную і практычную значнвсць, фармулюе асноўную мэту і задачы рэферата.

У асноўнай частцы (на матэрыяле вывучаных і законспектаваных літаратурных крыніц) выкладаецца змест пытанняў плана, якія раскрываюць сутнасць асноўных сучасных напрамкаў у разглядзе абранай тэмы. Тут жа, характарызуючы гэтыя напрамкі, студэнт выказвае сваю думку наконт той або іншай канцэпцыі, прыводзіць неабходныя аргументы.

У заключэнні ў сціслай яснай форме выкладаецца змест асноўных вывадаў па працы.

Рэферат уяўляе сабой самастойны выклад сутнасці выбранай тэмы на аснове вывучэння, агляду, даследвання першакрыніц друку. Рэферат павінен быць напісаны дакладнай, лаканічнай літаратурнай мовай. У ім не павінна быць паўтораў адных і тых жа думак, двухсэнсоўных выразаў.

Пры напісанні рэферата мэтазгодна выкарыстоўваць словы тыпу “так”, “такім чынам”, “варта” і да т.п. Яны даюць магчымасць не толькі лепш адлюстраваць абраную тэму, але і дапамагчы чытачу сачыць за логікай выказвання, калі аўтар пераходзіць да новай думкі.

Тэкст рэферата не варта перанасычаць мноствам тэрмінаў і іншамоўных слоў. У рэфераце мэтазгодна карыстацца тэрміналогіяй, прынятай у дадзенай галіне навукі і тэхнікі. Новыя тэрміны неабходна тлумачыць пры іх першым жа выкарыстанні.

Пры напісанні тэксту рэферата асноўныя палажэнні тэмы асэнсоўваюцца рэферэнтамі і могуць пераказвацца сваімі словамі. У выпадку неабходнасці яны падмацоўваюцца цытатамі.

Афармленне рэферата ўключае тытульны ліст, на якім указваецца тэма рэферата, прозвішча выканаўцы і ініцыялы, курс, факультэт, група, год напісання рэферата.